# ЗМЕНЫ Ў СТАТУСЕ СУДДЗЯЎ У ВКЛ У XVI СТАГОДДЗІ

**А. А. Міхневіч**

Праблема існавання прафесійных суддзяў уздымалася не адзін раз у Вялікім Княстве Літоўскім, аднак афіцыйнае замацаванне гэтага інстытута адбылося толькі ў Статуце ВКЛ 1529 года. У першым артыкуле шостага раздзела Статута, які быў прысвечаны судам і працэсуальным дзеянням, быў адзначаны адзін з фундаментальных прынцыпаў працэсу, якім і ў наш час з'яўляецца–прынцып законнасці. Нягледзячы на матэрыяльнае і сацыяльнае становішча асоб у дзяржаве, закон з'яўляўся адзіным для ўсіх. Калі было ўстаноўлена, што гэты прынцып парушаны, выносіўся новы вердыкт, які абавязкова заносіўся ў судовыя кнігі. Аднак артыкулы гэтага раздзела сведчаць, што ў той перыяд функцыі суддзяў выконвалі службовыя асобы адміністрацыі:

ваяводы, старасты, маршалкі земскія і іншыя, што ўказвае на залежнасць суда ад дзяржаўнай адміністрацыі і адсутнасць прафесійнай асновы гэтай дзейнасці [4, с. 65].

Пазней пасада суддзі становіцца выбарнай. У першым артыкуле чацвёртага раздзела Статута 1566 года было запісана, што суддзі земскага суда выбіраюцца са шляхецкага саслоўя (па чатыры суддзі ад павета). Адпаведна другога артыкула суддзі маглі судзіць усіх грамадзян ВКЛ, акрамя Вялікага Князя і яго ўраднікаў [5, с. 73]. У гэтым жа раздзеле было сказана некалькі слоў пра зарплату суддзяў, падсудкаў, пісараў за выкананне сваіх абавязкаў. Зарплата не была фіксаванай: судовыя службоўцы атрымлівалі грошы толькі тады, калі ў судзе разглядаліся нейкія скаргі, калі ж скаргаў не было – яны не атрымлівалі грошай. Гэты артыкул адначасова сведчыць аб тым, што ў ВКЛ з'явілася права апеляцыі, якое не рэгламентавалася другім артыкулам шостага раздзела Статута 1529 года [4, с. 63]. Статут 1588 года больш дакладна замацоўваў правы судовых службоўцаў на атрыманне грошаў за перагляд спраў, прычым судовыя службоўцы атрымлівалі іх адпаведна колькасці вырашаных спраў.

Статус суддзяў больш значна ўдасканальваўся ў Статуце 1588 года. У артыкулах 1 і 2 чацвёртага раздзела апісваецца парадак прызначэння на пасаду суддзі, падсудка, пісара і г. д [6, с. 72]. Паводле гэтых артыкулаў адбываліся выбары, якія насілі вельмі дэмакратычны характар. Амаль што кожны свабодны чалавек мог стаць суддзёй. Аднак на практыцы было не ўсё так прыгожа. Суддзямі і іншымі судовымі асобамі станавіліся толькі літвіны, якія мелі значны штогадовы прыбытак.

Асобна выдзялялася пасада замкавага суддзі. У кожным павеце староста або ваявода павінен быў назначыць на гэту пасаду сумленнага шляхціча (арт.21, р.IV Статута ВКЛ 1566 года). Як нам здаецца, гэтыя суддзі ажыцяўлялі паўнамоцтвы, якія належаць суддзям сучасных розных судоў (канстытуцыйнага суда, вярхоўнага суда і вышэйшага гаспадарчага суда разам). Бо яны вырашалі найбольш складаныя судовыя справы. Статутам 1566 года рэгламентавалася забарона вышэйшым службовым асобам выбірацца на пасаду суддзі ці інакш уплываць на ажыццяўленне правасуддзя праз сваіх дапаможнікаў [1, с. 158].

У працэсе ўдасканальвання судовай сістэмы з'явілася і праблема арганізацыйнай падпарадкаванасці ўсіх структурных элементаў судовай сістэмы. У законе гэтаму пытанню быў прысвечаны цэлы шэраг артыкулаў. Найбольш цікавым з якіх з'яўляецца трэці артыкул чацвёртага раздзела, дзе гаворыцца аб прыярытэтнай моцы земскіх судоў над ніжэйшымі судовымі ўстановамі.

У артыкуле 7 раздзела 4 Статута 1566 года ўпершыню ў гісторыі беларускага заканадаўства быў усталяваны яшчэ адзін з найважнейшых прынцыпаў судовага працэса–прынцып непасрэднасці ажыцяўлення сваіх абавязкаў суддзямі, падсудкамі, пісарамі. Акрамя іх ніхто не мог ажыцяўляць судовыя функцыі.

Для таго, каб зрабіць дзейнасць суддзяў больш дасканалай і прадуктыўнай, у другой палове XVI ст. былі створаны інстытуты падсудкаў і пісараў [2, с. 138]. Падсудкі з’яўляліся дапаможнікамі суддзяў, так званымі ніжэйшымі суддзямі. Статус пісараў быў прыкладна аналагічным статусу сучасных сакратароў судовага пасяджэння. Непасрэдна пісары складалі пратакол судовага пасяджэння, запісвалі судовыя скаргі грамадзян, а пасля сцверджання і падпісання гэтай скаргі суддзёй ці падсудкам, перадавалі яе ў вышэйшую судовую установу [3, с. 112]. За запіс кожнай скаргі ў адпаведнасці з шостым артыкулам Статута ВКЛ 1588 года пісары атрымоўвалі грошы. Рэгламентаваліся і іншыя працэсуальныя абавязкі суддзі, падсудка, пісара. Нельга не падкрэсліць, што з мэтай забеспячэння справядлівасці судагаварэння, гэтыя судовыя службоўцы пачыналі сваю працу за 3 дні да непасрэднага пачатку разгляда судовай справы. Гэта рабілася з мэтай ўнясення дакладных запісаў у судовыя кнігі, а таксама для папярэдняга разгляду абгрунтаванасці патрабаванняў, сфармуляваных у позвах. У сёмым артыкуле чацвёртага раздзела знайшло адлюстраванне паняцце бяспекі суддзі, падсудка, пісара і павагі да суду. Так, калі б нехта пагражаў словам судовым службоўцам, яго павінны былі арыштаваць на шэсць тыдняў. У выніку ж забойства ці нанясення цяжкага цялеснага пашкоджання суддзям, вінаватаму прызначалася смяротнае пакаранне. Адпаведна і суддзі за праяўленне непавагі да ўдзельнікаў працэсу караліся штрафам. За прымяненне ж фізічнай сілы да удзельнікаў працэса суддзі павінны былі адбыць шасцітыднёвы турэмны арышт, а за забойства ці прычыненне цялесных пашкоджанняў–адказвалі “горлам” (арт.41, р.IV). У Статуце закранаецца пытанне аб падсуднасці судовых спраў да пэўнага суда ў залежнасці ад справы. Так, забаранялася перадаваць справу ад аднаго суда іншаму (арт.44, р.IV). Калі ж хто-небудзь парушаў гэта правіла, дазвалялася абскарджваць рашэнне суда.

Патрэбна падкрэсліць, што нават пасля прыняцця Статута 1588 года не згубілі канчаткова свае судовыя паўнамоцтвы прадстаўнікі выканаўчай галіны ўлады. Менавіта ў паўнамоцтвах старастаў і ваяводаў праяўлялася абагульненне судовай практыкі і выданне пэўных нарматыўных актаў у сувязі з гэтым. Улічваючы ўсю моц і важкасць палажэння судоў ВКЛ, іх кампетэнцыя ў час правядзення павятовых соймікаў звужалася, або суд увогуле зачыняўся (арт.47, р.IV). Аднак,

раздзяленне ўлады паміж судовымі органамі і падпарадкаванне ніжэйшых судоў вышэйшым мела месца ўжо ў той час. Асабліва гэта тычыцца новых судоў, якія былі створаны ў працэсе судовай рэформы (земскія і інш.) Як бы не была абмежавана ўлада манарха ў любой манархічнай дзяржаве, значную (калі не галоўную) ролю ў судовай справе адыгрываў манарх. Яго слова мела вялікую вагу, а яго пячатка была патрэбна для зацвярджэння рашэнняў цэнтральных судоў. Абмежаванне яго паўнамоцтваў у судовай сферы было замацавана ўпершыню у дзесятым артыкуле чацвёртага раздзела Статута 1566 года, а потым у Статуце 1588 года (арт.12, р.IV). Хоць судовыя органы і сталі значна больш самастойнымі пасля судовай рэформы, Князь так і застаўся вышэйшым суддзёй, працягваў дзейнасць суд мясцовай адміністрацыі (гродскі суд), таму нельга гаварыць аб існаванні ў ВКЛ поўнасцю самастойнага суда.

Статут 1588 года заканадаўча замацоўваў належнасць такога органа ўлады, як Вялікакняжацкі суд (арт. 30, р.IV). У складаных жа выпадках Вялікі Князь мог заклікаць суддзю, падсудка і пісара з любога павета не больш чым на два тыдні для дапамогі ў вырашэнні судовых справаў (арт. 27, р.IV Статута ВКЛ 1566 года). Нельга адмовіць, што апарат суда эвалюцыяніраваў з кожным новым статутам. Калі па першым Статуце функцыі суддзяў выконвалі службоўцы мясцовай адміністрацыі, то па Статуту 1588 года меў месца падзел уладаў і дакладная сістэма судовых органаў. Нельга адмаўляць прагрэсіўнасць статутавых нормаў у параўнанні з падобнымі прававымі палажэннямі іншых тагачасных дзяржаў.

**Літаратаура**

1. *Доўнар Т. І.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мінск: Амалфея, 2008.
2. *Юхо Я. А.* Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мінск. 1992.
3. *Доўнар Ю.П.* Судовая рэформа XVI стагоддзя ў Вялікім княстве Літоўскім. Мінск: БДУ. 2007.
4. Статут Великого княжества Литовского 1529 года. Под редакцией академика АН Литовской ССР К.И. Яблонскиса. Мн.: Издательство Академии наук БССР, 1960.
5. Статут ВКЛ 1566 года: http://starbel.narod.ru/statut1566.htm.
6. Статут Великого княжества Литовского 1588 года [Электрон. ресурс]. http://starbel.narod.ru/statut1588.htm.